**Міхал Залескі**

# ПАРАЎНАНЬНЕ БАЗАВЫХ ПАКАЗЬНІКАЎ ЭКАНАМІЧНАГА РАЗЬВІЦЬЦЯ БЕЛАРУСІ Й РАСІІ (1991—2001 гг.)

На момант распаду СССР структура беларускай эканомікі была абумоўлена наступнымі фактарамі:

1) існаваньне ўдарнай заходняй групоўкі войскаў СССР — чырванасьцяжнай Беларускай ваеннай акругі, якая была параўнальна добра ўзброена, забясьпечана рэсурсамі для разгарненьня буйнамаштабнага наступу;

2) існаваньне прамысловай базы, якая выконвала вайсковыя замовы, комплексу з 200 прадпрыемстваў, якія і сёньня забясьпечваюць 95% беларускага экспарту;

3) разьвіцьцё аграпрамысловага комплексу шляхам меліярацыі блізка 4 мільёнаў гектараў зямлі з падвышанай вільготнасьцю, канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасьці;

4) стварэньне сыстэмы стратэгічных камунікацыяў: транспартных калідораў Азія—Эўропа і Балтыка—Міжземнамор'е, магістральных трубаправодаў Азія—Эўропа, транскантынэнтальных высакавольтных ЛЭП, узьлётных палосаў з даўжынёй, дастатковай для ажыцьцяўленьня міжкантынэнтальных палётаў.

Параўноўваючы эканомікі Беларусі й Расіі, трэба браць пад увагу наяўнасьць цыкляў у гаспадарцы абедзьвюх краінаў. Трэба прызнаць, што ў часы СССР існавала канкурэнцыя за рэсурсы, а таксама іхнае нераўнамернае разьмеркаваньне. Пры гэтым разабрацца ў савецкай статыстыцы і знайсьці ў ёй праўду для аб'ектыўнага параўнаньня гаспадарчай эфэктыўнасьці РСФСР і БССР — невырашальнае заданьне для такога невялікага тэксту. Дзеля гэтага далейшыя параўнаньні мы будзем рабіць, максымальна пазьбягаючы выкарыстаньня нацыянальнай статыстыкі.

Пачнём з тэндэнцыяў у базавых паказьніках. Сярэднегадавая колькасьць насельніцтва складала ў 1999 годзе ў Расіі 145,9 млн., а ў Беларусі 10 млн. чалавек. То бок насельніцтва нашай усходняй суседкі ў 14,5 разу перавышае беларускае. У абедзьвюх краінах сьмяротнасьць цягам апошніх дзесяці гадоў перавышае нараджальнасьць. У адрозьненьне ад Беларусі, у Расіі назіраецца і адноснае скарачэньне колькасьці прадстаўнікоў тытульнай нацыі.





Канцэнтрацыя насельніцтва ў сталіцы краіны у расійцаў значна меншая за нашую: 6% у Маскве супраць 17% у Менску. Але колькасьць насельнікаў маскоўскага мэгаполісу ў 10 разоў перавышае колькасьць насельнікаў менскага. Тэмпы ўрбанізацыі па краіне ў цэлым, аднак, вышэйшыя ў Беларусі, бо практычна ўва ўсіх расійскіх рэгіёнах за выключэньнем Каўказу і Падкаўказьзя міграцыйны патэнцыял вёскі вычарпаны, у той час як паўднёвы захад Беларусі здольны на працягу 20 гадоў даць да 800 тысячаў гараджанаў, асабліва калі пачнуць разбурацца мэліярацыйныя сыстэмы.

Плошча Расіі 17,1 млн. кв.км, Беларусі — 0,21 млн. кв.км, г.зн. у 82 разы меншая. Дзеля гэтага шчыльнасьць насельніцтва ў Беларусі амаль у шэсьць разоў большая — 48,3 чалавека на кв.км супроць 8,5 у Расіі. У Расіі праблема вялікай тэрыторыі ўскладняецца міжнацыянальнымі і міжканфэсійнымі канфліктамі, эканамічнымі праблемамі падтрыманьня жыцьцядзейнасці ў зоне вечнай мерзлаты.

Сярэдняя працягласьць жыцьця (зьвесткі 1998 г.) мужчын у Расіі — 61,3 году, у Беларусі (зьвесткі 1999 г.) — 62,2 году, жанчын, адпаведна, — 72,9 і 73,9 году. Падабенства ў разрыве паміж працягласьцю жыцьця мужчынаў і жанчынаў адлюстроўвае звышвысокі ўзровень алькагалізму, траўматызму, агульных захворваньняў і самагубстваў сярод мужчынаў у абедзьвюх дзяржавах.




Табліца 1. Полавая і ўзроставая структура насельніцтва Расіі (зьлева) і Беларусі (справа) паводле зьвестак ААН.

У суадносінах жанчынаў і мужчынаў Расія мае дадатнейшы паказьнік (1,12) у параўнаньні зь Беларусяй (1,14) дзеля меншай долі жанчынаў векам 60—80 гадоў, чымся ў Беларусі. Вышэйшая працягласьць жыцьця (асабліва сярод старэйшых узроставых групаў) стаўляе перад Беларусяй праблему мадэрнізацыі сыстэмы пэнсійнага забесьпячэньня, бо з выходам на пэнсію найвялікшай групы насельніцтва 1945—1955 гадоў нараджэньня суадносіны паміж колькасьцю фармальна працаздольных і пэнсіянэраў дасягнуць крытычнай адзнакі і папаўненьне пэнсійнага фонду стане праблематычным.




Табліца 2. Зьмяненьні рэальнага ВУП (у % да папярэдняга году) у Расіі (зьлева) і Беларусі (справа) паводле зьвестак ААН.

Паводле разьлікаў статыстычнай службы ААН, рэальны ВУП пасьля распаду СССР ў абедзьвюх краінах стала зьніжаўся. У Беларусі — да 1995 году ўлучна, а ў Расіі — да 1996. Пры гэтым сярэднегадавы тэмп спаду ВУП у Расіі ў 1991—1995 гадох быў вышэйшы, чымся ў Беларусі, на 0,7%.

Істотныя адрозьненьні ў тэмпавых паказьніках адлюстраваныя ў табліцы. Падрабязьней пэрыяд пасьля 1995 году мы разгледзім ніжэй на падставе зьвестак статыстычнага камітэту СНД.

Досыць параўнаць табліцы, каб пабачыць: больш як у палове выпадкаў зьмяненьні ў эканоміцы Расіі папярэднічаюць на год зрухам у процілеглым кірунку ў беларускай гаспадарцы. Каб заўважыць гэта, дастаткова ссунуць адпаведныя лічбы ВУП на адзін год, што і зроблена ў ніжэй зьмешчанай табліцы.

| | 1991 | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Расія | — | - | + | - | + | + | + | — | + |
| Беларусь | — | + | - | + | + | + | - | — | - |
| | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 |

Структуру спажываньня ў абедзьвюх краінах адлюстроўвае табліца 3:




Табліца 3. Індэкс спажывецкіх цэнаў (у адсотках да папярэдняга году) у Расіі (зьлева) і Беларусі (справа) паводле зьвестак ААН.





За ўвесь пэрыяд назіраньняў, адлюстраваных на дыяграме, толькі аднойчы, у 1997 годзе, у Расіі тэмп росту спажывецкіх цэнаў апынуўся ў межах, што не разглядаюцца як гіпэрінфляцыя ў стабільных эканоміках. Беларусь не дачакалася й гэткага. Пік інфляцыі ў Расіі прыпадае на 1992 год, у Беларусі — на 1994 г. Злом тэндэнцыі ў абедзьвюх краінах адбыўся ў 1996 годзе. Дагэтуль сярэднегадавы тэмп інфляцыі ў Беларусі быў у 1,6 разу вышэйшы за расійскі. Гэта ў вялікай ступені спрыяла росту эканамічнай актыўнасьці беларусаў у сфэры ценявой эканомікі.

Моцна адрозьніваецца і ўзровень беспрацоўя ў абедзьвюх краінах.

Табліца 4. Доля беспрацоўных, у адсотках да эканамічна актыўнага насельніцтва.

| | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Расія | 4,7 | 5,9 | 8,1 | 9,5 | 9,7 | 11,8 | 13,3 | 13,4 |
| Беларусь | 0,5 | 1,4 | 2,1 | 2,7 | 3,9 | 2,8 | 2,3 | 2,0 |

Крыніца: Статыстычны камітэт СНД*.

Калі падрабязьней, сумясьціўшы ў адной табліцы, разгледзець асноўныя паказьнікі дымамікі народнай гаспадаркі Беларусі падчас прэзыдэнтуры А. Лукашэнкі ў параўнаньні з адпаведнымі расійскімі паказьнікамі, можна акрэсьліць прынцыповыя разыходжаньні ў эканамічным разьвіцьці абедзьвюх краін.




Табліца 5. Прырост (зьніжэньне) валавога ўнутранага прадукту ў Расіі й Беларусі (у адсотках да папярэдняга году).

Аналіз дынамікі ВУП дазваляе пабачыць два выразныя этапы. Для Расіі першы зь іх быў зьвязаны з падзеньнем цэнаў на нафту, якое завяршылася дэфолтам у жніўні 1998 г. Крах расійскага рубля адносна даляра ЗША адзначыў завяршэньне этапу першапачатковага назапашваньня капіталу ў Расіі. У выніку Расія пераўтварылася ў дзяржаву трэцяга сьвету і сыравінны прыдатак Захаду. З 1999 году расійскі бюджэт пераважна фармуецца за кошт адлічэньняў з сыравіннага комплексу, які прадае на Захад газ, нафту, нікель і непілаваны лес.

Тым часам у Беларусі захавалася ўдвая больш супроць Расіі разгорненых за савецкім часам прамысловых магутнасьцяў, у тым ліку і сучасных кампанэнтаў ВПК. Дзякуючы адміністрацыйным мэтадам кіраваньня краіна здолела трымаць вышэйшыя за нулявую адзнаку тэмпы росту ВУП ажно з 1996 году. Але рост

* Тут і далей усе зьвесткі, прыведзеныя ў табліцах і графіках, даюцца паводле гэтай крыніцы. — *Рэд.*

прамысловай вытворчасьці суправаджаўся рэцэсіяй у сельскай гаспадарцы.

З 1997 году беларуская прамысловая вытворчасьць дэманструе ўстойлівую тэндэнцыю да паніжэньня тэмпаў росту. Такая ж самая карціна ў сельскай гаспадарцы. Агульная крэдыторская запазычанасць беларускіх калгасаў набліжаецца да мільярда даляраў паводле бягучага курсу Нацыянальнага банку.




Табліца 6. Прырост (зьніжэньне) інвэстыцыяў у асноўны капітал у Расіі й Беларусі (у адсотках да папярэдняга году).




Табліца 7. Прырост (зьніжэньне) перавозкі грузаў у Расіі й Беларусі (у адсотках да папярэдняга году)

На першы погляд здаецца, што Беларусь у інвэставаньні ў асноўны капітал далёка абагнала Расію. Але тут мы маем справу з паказьнікам унутраным і адносным. Беларускі рост да 1998 году быў абумоўлены крэдытаваньнем жыльлёвага будаўніцтва і выдаткамі на захаваньне маральна састарэлых рабочых месцаў ува ўсіх галінах вытворчасьці. Пры гэтым доля рэальных замежных інвэстыцыяў у вытворчыя фонды хінулася да нуля (асабліва калі ня ўлічваць выдаткаў “Газпраму” на падтрыманьне сваёй інфраструктуры на нашай тэрыторыі).

Расійскі крызыс 1998 году быў выкліканы спалучэньнем фінансавых чыньнікаў з кан’юнктурнымі ваганьнямі кошту сыравіны. Пасьля яго рух інвэстыцыйных патокаў у Расіі беспасярэдне, а ў Беларусі — ускосна, будзе залежаць ад выручкі экспартэраў сыравіны.

Статыстычны рост аграрнай і прамысловай вытворчасьці й інвэстыцыяў на Беларусі падаецца сумнеўным дзеля таго, што аб’ёмы перавозак перавышалі мінулагоднія толькі двойчы — у 1997 і 1998 гадох — і наагул не супадаюць па канфігурацыі графікаў прыросту.

У адрозьненьне ад гэтага, у Расіі гэты паказьнік больш адпавядае рэчаіснасьці, бо пачаў расьці разам зь зьяўленьнем рэсурсаў на куплю і перамяшчэньне грузаў і супаў з ростам паставак за межы краіны.

Нарастаньне крызысных зьяваў у эканоміцы Беларусі яскрава адлюстроўвае дынаміка экспарту на нашыя асноўныя рынкі. Толькі ў 1997 і 2000 гадох тэмпы экспартных паставак у краіны СНД (75% агульнага аб’ёму паставак) узрасталі ў параўнаньні з папярэднім годам. Расія, наадварот, няўхільна нарошчвала экспарт за выняткам крызысных 1998 і 1999 гадоў, але структура гэтага экспарту ўсё больш адпавядае экспарту краінаў трэцяга сьвету.








Табліца 8. Прырост экспарту ў краіны СНД з Расіі й Беларусі (у адсотках да папярэдняга году).




Табліца 9. Прырост экспарту ў краіны, якія не ўваходзяць у СНД, з Расіі й Беларусі (у адсотках да папярэдняга году).

Акурат з гэтае прычыны такія падобныя графікі Расіі й Беларусі ў табліцы 9. Бо беларускі экспарт у разьвітыя краіны — на 80% экспарт сыравінны: калійныя солі, непілаваны лес, паўфабрыкаты.

Сынхроннасьць патокаў імпарту з краінаў СНД у Расію і Беларусь можа сьведчыць толькі аб адным: гаспадарчыя сувязі часоў СССР захаваліся ў поўным аб’ёме і ніколі не разрываліся. Бо, каб графікі істотна адрозьніваліся, павінна зьмяніцца структура і аб’ём вонкавага гандлю.




Табліца 10. Прырост імпарту з краінаў СНД ў Расію і Беларусь (у адсотках да папярэдняга году).




Табліца 11. Прырост (зьніжэньне) імпарту з краінаў, якія не ўваходзяць у СНД, у Расію і Беларусь (у адсотках да папярэдняга году).

Гэта выразна відаць на графіку імпарту з краінаў, якія не ўваходзяць у СНД. Беларусь стала скарачала вонкавы закуп да памераў г.зв. “крытычнага імпарту”. Расія, насупраць, калі цэнавая кан’юнктура на сусьветным рынку сыравіны гэта дазваляе, робіць вялікія закупы, прычым ня толькі тэхналёгіяў і абсталяваньня, але спажывецкіх тавараў і прадметаў раскошы. Палова харчовых тавараў у расійскім гандлі — імпартныя.

Было б несправядліва гаварыць, што “беларускага эканамічнага цуду” не існуе. Прынамсі, тавараабарачэньне раздробавага гандлю вымушае задумацца любога скептыка. Ваганьні гэтага паказьніка, бадай, найбольш адрозьніваюць Беларусь ад суседніх краін. Можна меркаваць, што, пачынаючы з 1997 году,




Табліца 12. Прырост (зьніжэньне) тавараабарачэньня раздробавага гандлю ў Расіі й Беларусі (у адсотках да папярэдняга году).




Табліца 13. Прырост індэксу цэнаў вытворцаў прамысловай прадукцыі ў Расіі й Беларусі (у адсотках да папярэдняга году).

уздымы расійскага тавараразвароту зьвязаныя з падзеньнямі беларускага найхутчэй праз дваісты ўплыў шэрага бізнэсу, у якім беларусы дасягнулі вялікіх посьпехаў. Да таго ж, тавары з крамаў робяцца аб’ектам памежнага гандлю — спэкуляцыяў, заснаваных на кантрабандным перамяшчэньні тавараў праз празрыстую мяжу наўпрост з заводаў-вытворцаў.

Нават нязначны рост цаны на расійскую сыравіну і камплектуючыя выклікае хвалю росту цэнаў на прадукцыю беларускіх вытворцаў, што цягне за сабой скарачэньне іх канкурэнтаздольнасьці і прымушае пераходзіць да розных бартэрных і ўзаемазаліковых схемаў.

Што да прагнозу, то ў гэтай справе трэба ўлічваць вонкавыя і ўнутраныя чыньнікі. Галоўны з вонкавых чыньнікаў становяць сабой тэмпы росту спажываньня арганічнай сыравіны ў сьвеце на фоне разгарненьня канфлікту поўдзень—поўнач. Калі гэты канфлікт, ад Філіпінаў, Малайзіі й Судану да Босьніі й Чачэніі, і нават да Башкірыі й Татарыі (бо зьвязаны з ісламскім фактарам) будзе разгортвацца, то ў расійцаў будзе ўзрастаць патрэба ў беларускім транзыце, беларускім ВПК. Беларусь будзе выкарыстоўвацца расійцамі як пасярэднік у гандлі зброяй.

Што да ўнутраных чыньнікаў: да 2010 году насельніцтва нашай краіны скароціцца больш чым на паўмільёна чалавек. Ня выключана, што разбурэньне мэліярацыйных сыстэмаў выкліча масавую міграцыю з паўднёвага захаду краіны ў гарады, а дэпапуляцыя на поўначы Беларусі й на яе ўсходзе абумовіць канчатковы заняпад калгасаў і абвострыць харчовую праблему. Разбурэньне ж асноўных фондаў пацягне за сабой дэградацыю вытворчасьці, уведзенай у лад у 70—80-я гг. ХХ ст. (ужо ў 1990—2000 гг. колькасьць аварыяў і катастрофаў на прамысловасьці ўзрасла ў чатыры разы).

Аналягічныя працэсы будуць разгортвацца і на тэрыторыі Расіі. У дадатак да ўсяго яны будуць узмоцненыя дэзінтэграцыяй дзяржавы і актыўнасьцю транснацыянальных карпарацыяў. Уплыў транзытных сыравінных патокаў прывядзе ў Расіі да дэградацыі эканамічных зонаў, нецікавых для капіталу.

KAMUNIKAT.org